# Да якасці праз адукацыйны кластар

**Тры вядучыя тэхналагічныя УВА краіны — Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання і Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт — аб'ядналіся ў адзіны рэспубліканскі вучэбна-навукова-вытворчы тэхналагічны кластар. Адпаведны дагавор аб яго ўзнікненні падпісалі рэктары вышэйшых навучальных устаноў.**

Як паведаміў рэктар Магілёўскага ўніверсітэта харчавання Максім Кіркор, ідэя стварэння адукацыйнага кластара існавала даўно, сёлета ж яе вырашана было ўвасобіць у жыццё. Ініцыятыва ішла ад усіх кіраўнікоў УВА.

— Прытрымлівацца сучасных адукацыйных тэндэнцый, імкнуцца да якаснага навучання сумеснымі намаганнямі значна прасцей, чым у адзіночку. Кластар адкрые перад нашымі ўстановамі бязмежнае поле сумесных праектаў. Разам мы будзем працаваць над фарміраваннем інавацыйных падыходаў да тэхналагічнай адукацыі, — адзначыў Максім Аляксандравіч.

Паводле яго слоў, у рамках дагавора прадугледжваецца шырокі спектр супрацоўніцтва тэхналагічных універсітэтаў: інтэграцыя рэсурсаў, мерапрыемствы па абмене вопытам і вынікамі работ у інавацыйнай, навукова-тэхнічнай і адукацыйнай сферах, ажыццяўленне фундаментальных і прыкладных даследаванняў, патэнтнай дзейнасці і трансферу тэхналогій, рэалізацыя сумесных адукацыйных праграм падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі і дадатковай адукацыі дарослых.

— Формамі агульных мерапрыемстваў будуць сімпозіумы, семінары, канферэнцыі, круглыя сталы, курсы павышэння кваліфікацыі і прафесійнай перападрыхтоўкі, майстар-класы, прафесійныя стажыроўкі, рэалізацыя навукова-даследчых праектаў і сеткавага навучання студэнтаў па вучэбных праграмах вышэйшай адукацыі, — расказаў Максім Кіркор.

У якасці першачарговых крокаў узаемадзеяння будзе сфарміравана рабочая група па стварэнні сумеснай галіновай навукова-вытворчай лабараторыі па палімерных кампазіцыйных матэрыялах. Акрамя ўніверсітэтаў, у яе плануецца ўключыць ААТ "Магілёўхімвалакно" і шэраг іншых прадпрыемстваў хімічнай прамысловасці. У планах таксама развіццё супрацоўніцтва з карпарацыяй "Раснана".

Што тычыцца адукацыйнай сферы, тут будуць прыняты меры па распрацоўцы сумесных вучэбных праграм бакалаўрыята і магістратуры па аўтаматызацыі, біятэхналогіях, нафтахіміі, інфармацыйных тэхналогіях, дызайне і іншых напрамках.